Асобны № каштуя усюды 50 кап.

Працоуны народ усіх краеу—злуйчася!

ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту і Маскоускай Беларускай Сэкцыі Р. К. П. (бальшэвікоу).

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ля пярасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідае сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымае і радактар.

КОШТ ГАЗЭТЫ.		
	У РАСЕІ.	ЗА ГРАНІЦУ.
1 м.	1 р. 80 к.	3 р — к.
2 м.	3 р. — к.	4 р. — к.
3 м.	4 р. 25 к.	6 р. — к.
4 м.	6 р. — к.	8 р. 70 к.
6 м.	8 р. 50 к.	12 р — к.
9 м.	13 р. 50 к.	18 р. — к.
12 м.	17 р. — к.	20 р. — к.

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некулькі экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Пречистенский бульв., д. 29, кв. 24. Тел. 1-16-02.

№ 4 (48).

Масква, 1919 г. 8 Фэураля.

Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц.

II год выданьня

Канфэрэнцыя згоды у хаурусникау.

17 января нов. стілю у Парыжы адчынілася канферэнцыя з прадстаунікоу урадау пяці вялікіх дзяржау: Англі, Францыі, Паучночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатау, Італі и Гапоні. Прадсядатэлям гэтае пастаяннае канфэрэнцыі аж да астатняго замірэньня выстауляны францускі прамьер-міністр Клемансо. Ужо адзін выбар прадсядацеля канфэрэнцыі сьведчыць аб тым, што у адносінах да равалюцыі, асабліва сацыяльнае, канфэрэнцыя займя варажную пазыцыю. Кожнаму ведама, што Клемансо увесь час трымауся варажнаго погляду на Расейскую равалюцыю і упарта трэбавау умяшацельства у расейскія справы, каб сілаю прымусіць Работніча-Селянскі урад адцурацца ад уласьці і перадаць ле у рукі контар-равалюцыянэрау. Перад самым пачаткам канфэрэнцыі, калі паднялося на усей гестрасці пытаньня аб прадстуніцтвя там Расеі, то Клемансо першы выказау думку, што з усіх урадау, якія маюцца на тэррыторыі (абшары) Расеі належыць хаурусьнікам лічыць поунамоцным Колчака. Дык вось як далёка ідзе кансэрватыуная палітыка Клемансо: ад Колчака адцураліся і пастанавілі весці з ім барацьбу нават нашы правыя эс-эры, а Клемансо толькі і лічыць яго, як належнаго прадстауніка Расеі.

Але у першых пасядзэньнях канфэрэнцыі вялоунічы пэнт Клемансо трохі спау. Вільсон, прэзыдэнт Амэрыканскіх Штатау, лічучы сябе павадыром усясьветнае дэмакраціі, цьвёрда стау на сваіх 14 пунтах, і яму удалося пацягнуць за сабою ле..ау канфэрэнцыі у пытаньні аб расейскіх справах. Гэтая пытаньня, абрысованая францускім ярукам, як натта далікатная і трэбуючая асабліве цікавасці да сябе, было пастауляна першым на разгляд канфэрэнцыі. Праз тую блытаніну, якае здаецца «хаурусьнікам» у Расеі, парашэньня расейскаго пытаньня зацягнецца надоуга, да тых часау, пакуль канфэрэнцыя ня выявлая належна і у поунасці палітычнаго палажэньня у Расеі. Аднака і пасля першых пасядзэньняу канфэрэнцыяю, бяз павядамленьня ад каго, выробляна адозва, у якой зануляяцца, што «хаурусьнікі» з жальбы да расейскаго народу ня маюць у поглядзя мяшацца у расейскія справы і пасылаць у Расею сваі вайскі. Гэтую пастанову яны падмацоуваюць тым рахункам, што умяшацельства толькі паслужыла б к злажэньню у Расеі моцнае нацыянальнае арміі і працягу вайны, якое ужо ніхто ня хоча і ня можа даляй весці. За гэтымі славамі хаваюцца іншыя думкі — полах перад равалюцыяю. Ужо у Гіндыі ідзе рух. Ірландзія, пад бокам Англі, апавяшчая сваю незалежнасць і правазгалашая у сябе рэспубліку. Францускія рабочыя так сама нязгодны з палітыкаю свайго ураду. Тоя самая можна сказаць аб кожнуй стране. Вось апаска равалюцыі ад працягу вайны і прымушая хаурусьнікау мяшацца у расейскія справы. Наадварот, хаурусным грашаунікам і прамысловікам больш прыемны іншы напрамак: як мага хуччэй пачаць абіраньня расейскаго народу праз грашавыя і прамысловыя дзеі, дзеля чаго патрэбна толькі заспакаеньня у Расеі. Каб дамагчыся сваіх мэтау хаурусныя грашаунікі і адцураюцца ад вайсковых пасыланьняу у Расею, бо гэтым распальвалася б толькі варажнасць да іх. Ім добра ведама, што партыя правых эсэрау, на усе часы стаяушых за ед асць с «хаурусьнікамі», цяпер, як сталі ясныімі захопныя пляны і мэты іх у адносінах да Расеі, шукаюць згоды з Радаваю уласьцю. Вось каб варажнасць расейскаго народу ня узрастала, а меньшылася. «хаурусьнікі» на канфэрэнцыі парашылі ня чапаць Расеі, а даравацъ іой можнасць самой нарыхтаваць свае справы.

Але ня абасьмельваючыся пасылаць сваіх вайскоу у Расею, «хаурусьнікі» баяцца працягу грамядзянскае вайны тут між працоунікамі і буржуазіяй і яе прыхільнікамі. Яны добра ведаюць, што бяз іх падтрыманьня банды Краснова, Дэнікіна, Колчака ня змогуць устаяць супроць моцнаго расейскаго пралятарыяту і яго чырвонае арміі. Дзеля гэтаго, захоуваючы інтарэсы расейскае буржуазіі і усіх контар-равалюцыянерау, сябры па канфэрэнцыі радзяць усім урадам, зложаным у Расеі, прыпыніць вайсковыя дзеі і заявіць, на якую зямлю яны пратанзуюць. Калі б гэтая прапанова была атрымана, то была умацована з'ява быцьця і прызнаньня уласьці розных урадау Расеі. А тым часам многія урады цяпер трымаюцца толькі гвалтоу'ям, уціскам: напрыклад, сібірскі Колчака ці Данскі Краснова. Працоуны нарсд гэтых зямель зусім нязгодзян прызнаць над сабою уласьць буржуазна-манархічнае дыхтатуры, і праз гэта быцьцё урадау Краснова ці Колчака нязходна нават с пунтам Вільсона аб самаапрэдзяленьні народау. Праз гэта барацьба с контар-равалюцыяй у Расеі ня можа скончыцца да тых часоу, покуль яна ня будзя адоляны і зусім зніштожана.

Але «хаурусная» канфэрэнцыя глядзіць на гэта інакшай. Яна, быццам шкадуючы расейскі народ за яго пакуты, радзіць зрабіць канец іой праз палюбоуную згоду між боручыміся. Каб згаварыцца між сабою і з прадстаунікамі «хаурусьнікау», апошнія прапануюць кожнаму з расейскіх урадау прыслаць сваіх прадстаунікоу на адну з Прынцавых выспау у Мрамарнум моры, нядалёка ад Канстантынопалю. Выбіраючы такі спосаб і мейсца згаворау калі яны адбудуцца, канфэрэнцыя мая этою зусім аддзяліць параду ад сьвету і ня даць іой зносін с апошнім. Клемансо і яго сябром ведама, што расейскі пралятарыят у кожнум сваіом парашэньні, пастанова звяртауся-б да працоунікау усяго сьвету, клічучы яго у сьведкі і да падтрыманьня равалюцыйных поглядау, як я б былі паложаны у закладзіну згаварау. Калі б расейскія дэлегацыі знаходзіліся, напрыклад, у самом Парыжы, то гэта паслужыла б найлепшым спосабам дзеля прапаганды сацыяльных думак і поглядау, якія прынясла б с сабою дэлегацыя ад Радаваго ураду. Вось, баючыся апошняго, канфэрэнцыя і выбрала далёкую ад палітычных цэнтрау выспу, як мейсца парады.

Расейскі пралятарыят заслужыу больш пачэсная мейсца. і іон будзя гаварыць у іншум мейсцы і з іншымі людзьмі. Іон будзя выяуляць сваю волю на міжнародпум з'ездзя пралятарыяту, пры стварэньні III Інтэрнацыянала, а ня на глухой незнаёмуй выспя у Мрамарнум моры.

М. Н.

Значнасць апавяшчэньня Беларусі Радаваю Распублікай.

Мэтаю палітычнаго развіцьця кожнаго народу з'яуляяцца поуная вольнасць ці нязалежнасць. А калі мы пад народам наагул будзямо разумець працоуны народ тае ці іншае зямлі, то мэтаю развіцьця яе мы павінны лічыць вольнасць і нязалежнасць працоунікау. У калішнія часы, калі сацыялістычная навучэньня было толькі у пачатку, або ж як яго усім ня было, мэтаю гасударсцвянасці і народу ставілася валадарства аднаго народу над другім, залежнасць бедных ад багатых. Пакараны слабейшы народ мусіу падчыняцца адоляушаму і ня меу тых правоу, якімі карыстауся заваяваушы. Так сама і у адном гасударсцвя, у аднаго народу ня усе былі роуными: працоунікі былі пад палітычным уціскам і аканамічнуй залежнасці ад багатых. Сацыяльная ж навучэньня, якоя у сучасны момант атрымала верх над імпэрыялізмам і валадарствам грашаунікоу, трэбуя зраунаваць беднаго з багатым, быушаго пабарніка с адоляным і пакараным. Іш кажучы, кожны чалавек мая аднакавая права на жыцьціо і дзеля гэтаго аднакава павінян карыстацца дабром, якоя даецца зямлёю, працаю і культураю. Праз гэта сацыялізм, стаючы на заахова правоу кожнаго, асабліва таго, у каго гэтыя правы гвалтоуня адабраны, трэбуя палітычнае нязалежнасці аднаго народу ад другога і сказаваньня саслоуных падзелау на багатых і бедных, бо багатыя заусіоды карысталіся працаю бедака, ставячы яго у аканамічную ад сябе залежнасць.

Расея першая з усіх гасударствау зрабіла зварот да сацыялізму, хоць сацыялізм ня зусім яшчэ умацавауся у іой. У равалюцыі равалюцыі сацыяльнае шмат ворагау, і пакуль яна ня адоляя іх, да тых часау нельга зрабіць усіх тых зьменау у грамадзянскум устрою, якія трэбуюцца сацыялізмам. Аднака і у гэтыя часы пераходу ад манархічна-буржуазнаго устрою да сацыялізму Расейская равалюцыя паказвая з'явы сацыяльных промінау. Адным з іх, гэтых промінау, з'уляяцца апавяшчэньня самавітасці і незалежнасці, у федэратыунум звязку, невялікіх народау. Такія дробныя народы, як латышы, літоуцы ці беларусы, аб якіх пры старом парадку чыноуніцтва ня гаварыла інакшай, як с пасьмяхам, зусім ня лічучыся з імі, як асаблівымі народамі. гэтыя народы атрымалі права на уласная палітычная жыцьціо. Аб чым ня маглі яны і гадаць пры манархізмя, чаго ня маглі дачакацца пры кааліцыйнум урадзя, тоя дадзяна ім паступам сацыяльнае равалюцыі, якая адна толькі і магла зрабіць гэта, як пабарніца за сацыялізм, за поуную вольнасць народау.

З'ява апавяшчэньня Беларусі асабліваю Радаваю Распублікаю мая дзеля яе вялікую значнасць. Перш усяго яна мая вялікую вагу дзеля заахова палітычных правоу беларускаго працоунаго народу. Дагэтуль наш народ заусіоды знаходзіуся пад чужым валадарствам: то ім круцілі польскія паны і шляхта, то здзекаваліся чыноунікі і паліцыя царскае Расеі. Як дзеля адных, так і дзеля другіх Беларусь была чужым краям, і яны стараліся толькі аб тым, каб як мага найбольш выцягнуць з народу дзеля сабе карысці. Народ адпіхауся у бок ад усіх палітычных і гасударсцвяных справоу, трацiу усякую цікавасць да іх і заставауся далёка ад палітычных інтарэсау і зразуменьня іх. Калі ж дзе-ня-дзе падымауся рух, заводзілася хоць самая звычайная прасьветная установа, то туды нарыхтоуваліся царскія жандары і чорнасотнікі і распаусюжвалі усіх і усіо. І беларускі працоуны народ, здавалася, назаусіоды патраціу магчымасць мець свае жаданьня, сваю палітычную будучыну: так моцна трымау яго у лятаргічнум сне стары парадак. Апавушчэньня на Беларусі Радавае Распублікі і даруя магчымасць народу самаму заняцца, бяз прыгону з боку, устроям свайго жыцьця. Радовы ж устрой, у закладзіня сваіой пралятарскі, перадае усю уласьць у рукі працоунікау — рабочых і селянства, ці як раз у рукі тых, хто дагэтуль быу атціорты ад услкае прыхільнасці да уласці. У гэтум перадатку уласьці у рукі беларускіх працоунікау і ляжыць будучына развіцця палітычнаго зразуменьня іх, у асобку селянства, якая да гэтых часау мела нявялікую сьвядомасць у палітычных пытаньнях.

Але яшчэ большую значнасць мая апавяшчэньня Беларусі Радаваю Распублікаю у аканамічных адносінах. Беларуская селянства ад селянства іншых краіоу і зямель рожніцца сваею страшэннаю убогасьцю. Апошняя залежала ад малазямельля. У той час, як панскія маіонткі часта налічваюць некулькі тысячау ці дзесяткі тысячау дзесяцінау, селянскія гаспадаркі гібеюць на маргу ці паумаргу зямлі. Ведома, што селянства маючы такія гаспадаркі, ды яшчэ з няплодзяваю зямліою, было натта убога. Так сама і працоуна—рабочы кляс па Беларусі па розным майстроуствам ня мог пахваліцца сваім жыцьцям. уцякаючы з віосак ад голаду, селяня ішлі у гарады ці к панам у парабкі і згаджаліся працаваць за мізэрную цэну. Зарабіць трэба было, рабову пры нявялікуй прамысловасці знайсці было трудна, а працоунікау шмат; імучыя гаспадары карысталіся гэтым і плацілі натта танна. Радавы устрой, пярадаючы усю уласьць працоунікам, разам з гэтым пярадае ім і карыстаньня зямліою, усім дабром, маетнасцю і здабыткамі сваіой працы Была ужо на Беларусі Распубліка, і хоць звалася яна Народнаю, але нічога ня дала дзеля народу, бо урад быу зложаны ці с паноу ці с падлізьнікау іх. Цяпер жа усе паны згінуць, згінуць тыя, хто смактау кроу і пот беларускаго селяніна і рабочаго, бо апошнія самі становяцца з гэтых часау гаспадарамі свае краіны і усяго яе добра. А каб гэтая дабро корысталася як мая быць, каб яно бяраглося і ня трацілася дарэмна і бяз карысці, трэба, каб сам гаспадар і наглядау за ім, шанавау яго. З гэтаго відаць і другі сэнс складу свае, мейсцовае уласці з мейсцовых людзей: яны лепш, чымся прышоушыя з боку, нарыхтуюць агульную гаспадарку, будуць больш шкадаваць яе, хуччэй умацуюць сацыялістычны устрой лепяй ведаючы варункі і звычаі мейсцоваго жыцьця. Дык вось у чым глауней... значнасць тае з'явы, што Беларусь стала Радаваю Распублікаю.

Неманскі.

Аб выдзяленьні Вітабскае губ.

У нявымоуна цяжкіх варунках пау стала радавая Беларусь; перад яе камуністычным урадам стаіць столькі важкіх і пяухільных заданьняу, што трэба няймаверные моцы волі і веры у сьвятасць свае справы, каб ня апусьціць бязсільна рук і ня адступіць пярад іх пагражаючаю масаю. Каб пяралічыць усе нашыя страты за часы праклятай бойні, дык прышлося—б гаварыць тры дні і тры ночы. А каб направіць іх, дык патрэбны доугія годы нясьціханнай працы усіх сыноу народу беларускаго і нават ня толькі іх, але і усіх суменных грамадзян Беларускаго краю. У гэты цяжкі і адказны момант у жыцьці нашае бацькаушчыны патрэбна найцясьнейшая аб'яднаньня усяго жывога і творчаго. Сацыяльная барацьба, змаганьня з душыцялямі працоунаго люду яшчэ ня скончыліся. Контр-равалюцыя зьбірая свае сілы і гатуяцца пачаць наступ проціу работнікау і сялян.

Польскія паны, якія у цягу сотнях гадоу смакталі кроу нашаго народу, хочуць аднавіць дауней...ыя часы. Яны вайшлі у паразуменьня са сваімі сваякамі з каранной Польшчы і праз Варшаускі урад зьвяртаюцца аб падтрыманьні да заходня—эуропэйскіх разбойнікау.

Праз сваіх далягатау на мірнуй конфэрэнцыі польскі урад патрабуя пярадачы яму усее заходняе Беларусі — Мінскае, Віляпскае і Гродзянскае губ. Пагроза польска-панскай нявол і цяжкім камянням віс'іць над Беларусяй і патрабуя ад Беларускаго ураду самае нангарачэйшае працы над арганізаваньнем ямадпору. Павіннасьць усіх грамадзян Беларускаго краю і нават больш,— павіннасьць усіх істых равалюцыянэрау і камуністау прыйсьці на падмогу Беларускаму ураду у яго цяжкум палажэньні.

Але, як на жаль, ня усе таварышы разумеюць гэта. Зьезд радау Вітабскае губэрні ухваліу пастанову аб выдзяленьні Вітабшчыны са складу Беларускае Рэспублікі. Мы яшчэ ня ведаям, чым кіраваліся Вітабскія таварышы, але мы заяуляем ім: „Вы робіця вялікую абмылку. Вашая пастанова прынясе нялічаную шкоду як Беларусі, так і усей справя сацыяльнае равалюцыі, а значыць, і вам. Мы просім неабоунна даць нам адказ на гэткія пункты:

1) Чаму вы сваім выдзяленьням паменьшаяця моц сапраудлівасьці Беларускаго ураду пярад польска-панскаю рэакцыяю? Ці жа вы думаяця, што раз польскія захопныя дамаганьня ня датыкаюцца вашае губэрні, дык вы можаця астацца у баку? Няужо вы ня ведаяця, што пабеда рэакцыі у адной мяйсцовасьці пралажыць іой дарогу і да далейшых пабедау? Няужо вы ня памятаяця, што у чася татарскаго пагрому такая дэзорганізацыя аддала у рукі татарау усю тагдашнюю Русь? Няужо вы ня разумеяця, што ваш паступак падобны да страусаускаго спосабу хаваньня ад небазпекі?

2) Чаму вы адрываяця ад Беларусі найменьш пацярпеушую ад вайны яе частку і пакідаяця спустошаныя Міншчыну, Віляншчыну і Гродзяншчыну у адных біцца над няпадсільным заданьням свае адбудовы?

3) Можа вы думаяця, што Вітабшчына, гэта ня Беларусь? Калі гэтак,—дык вы, таварышы, моцна памыляяцеся. За вылічэньням трох пярвважна латышскіх паве-

(Дзвінскаго, Рэжыцкаго і Люцынскаго) рэшту Вітабскае губэрні мая этнаграфічна-чысты і бязспрэчна-беларускі характар. Усе вучоныя скажуць вам гэта, спакойная абъектыўная параўнаваньня Вітабшчыны з Міншчынай, альбо Віляншчынай вачавідкі пакажа вам, што яны часьці аднаго краю.

Чым выклікана вашая пастанова? Дайця адказ.

Павал Любецкі.

Патрэбнасьць прадстаўніцтва Беларусі пры Расейскуй Радавуй Распубліцы.

З'ява апавяшчэньня Беларусі асаблівою Радаваю Распублікай трэбуя уперад усяго пастаянных зносін у справах кіраваньня і агульнае сацыяльнае будоулі, каторая павінна выпаўняцца па едзіному плану ва усіх землях, дзе умацоўваяцца сацыяльная равалюцыя. Ні адна гасударсьцвяная асабістасьць ня можа жыць толькі сваім жыцьцям, але кожная з іх павінна мець той ці іншы звязак з іншымі народамі у палітычных і аканамічных пытаньнях. Асабліва патрэбны такія звязкі с тымі народамі і землямі, з якімі гэтая гасударсьцвяная асабістасьць мае агульныя мэты гістарычнаго развіцьця, мая еднасьць у культуры і аканоміцы, як у прошласьці, так і у будучыні. Дзеля гэтаго абъеднаньня у напрамку дзейнасьці і павінна быць прадстаўніцтва адное народнасьці перад другою. Яно і будзя звязваць абедзьві стараны і іх народы у розных запытаньнях справах жыцьця і будучаго напрамку палітыкі іх з розных бакоў.

Перад маладою Беларускаю Радаваю Распублікаю у сучасны момэнт стаяць важкія пытаньня, бяз парашэньня якіх нельга спадзявацца на хуткая узраджэньне жыцьця беларускаго працоўнаго народу. Чатырохгадоваю імпэрыялістычнаю вайною Беларусь зусім пакрыўджана і разрурана; спаляны ці зьніштожаны цэльня вёскі, мястэчкі і гарады, гаспадарка скасавана, вагромністыя кавалкі зямлі, уперад абраблянае, цяпер пустуюць і парасьлі зельлям; многа беларускаго народу і да гэтых часаў блукаяцца у выгнаньні па чужых краіох; розныя культурныя установы ці вывязяны у Расею ці зусім згіблі. Вось, коратка кажучы, якою з'явішча прадстаўля Беларусь, вось якія руіны бярэ пад сваю уладу наша Радавая Распубліка. У дадатак да гэтаго абрысу трэба дадаць, што і на гэтыя руіны точаць зубы суседзі, а унутраны вораг—панства сударжна чапляецца за іх і пражэцца ня даць народу [illegible] будаваць на гэтых руінах новая жыцьця [illegible] Беларускаму народу [illegible] карэтную барацьбу, каб адо [illegible] клясовых ворагау і справіцца [illegible] аднаўленьня культурнаго гаспадарскаго жыцьця. Дзеля гэтае барацьбы патрэбны і людзі, і грошы, і розныя матэрыял, і начыньня, і скаціна, і харч. Многа гэтаго Беларусі знайсьці у сябе у дастатку ня можа: чаго ня зьніштожыла вайна, было разграблянa немцамі за часы акупацыі. Бяз падмогі з боку Беларускуй Распубліцы ня справіцца з задачаю адбудовы краіны. Гэтая падмога павінна быць зроблена перш усяго з боку таго народу, з якім Беларусь ад веку звязана агульнасьцю гістарычнаго развіцьця і з якім мая агульныя мэты у будучыні. Гэта — расейская селянства і пралятарыят.

Дзеля адбудовы свайго жыцьця Беларуская Радавая Распубліка і павінна карыстацца магчымаю падмогаю з боку Расейскаго Работніцка-Селянскаго ураду. **А каб нарыхтаваць гэтую падмогу, размяркаваць належна сілы і справы падмогі, патрэбна пастаянная прадстаўніцтва Беларусі пры Расейскуй Радавуй Распубліцы.** Па усіх пытаньнях, як бежанская, рэвакуацыя розных грамадзянска-гасударсьцвяных ці культурных установаў і іх служачых, грашавыя падмога, кірунак у палітычных справах і інш. беларуская прадстаўніцтва будзя у пастаяннуй еднасьці з расейскім урадам, заахоўваючы інтарэсы і патрэбы беларускаго працоўнаго народу.

Што Расейскі урад дбая аб долі Беларусі, што іон ня пакіня яе бяз падмогі, відаць с таго, што загадчыкам па іназемным справам прапанавана ураду Беларускае Радавае Распублікі сфармаваць сваю дыпламатычная прадстаўніцтва. Будзям спадзявацца, што наш урад скарыстая гэтую прапанову, прышле свайго прадстаўніка і тым паскорыць парашэньня многіх палітычна-аканамічных пытаньняў, адкладаць якія надаляй ніяк нельга.

Я. Петровіч.

Гэрманскі Установны Збор.

Дніом, калі будзя адчыняны Гэрманскі Установны Збор, назначана 7-я фэўраля. Цяпер ужо апавяшчоны падрахункі выбараў. З іх відаць, што найбольшую вагу у Установным Зборы будуць мець правыя сацыялісты па тыпу Шэйдэмана і Эберта. Але, хоць такіх сацыялістаў будзя большасьць, толькі з сацыялістаў склад будучаго урад у нямагчымы, бо давальна значную частку прадстаўнікоў маюць і буржуазныя партыі. Значыцца, бліжэйшы гэрманскі урад будзя буржуазна-згоднічы с пераваґаю права-сацыялістычных элементаў. Што ж датыркаяцца да крайніх партыяў, як лявых, так і правых, то іх натта мізэрны лік, або ж і зусім німа у спісах выбраных прадстаўнікоў. Так хаўрус спартакаўцаў, ці камуністычная партыя пакуль што ня мая сваіх таварышаў між членамі Установнаго Збору.

Шэйдэман і яго сябры распаўсюжылі гэтую партыю у апошнюю спробу са [illegible] зварату і равалюцыі, [illegible] уцекам сваіх страшэнных [illegible] Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург [illegible] уласьці працоўнікаў у бліжэйшыя часы. З боку [illegible], што у Гэрманіі [illegible]цавалася равалюцыя буржуазная, і яна ужо скончыцца з Установным Зборам. Але, усамдзеля, у Гэрманіі равалюцыя ня зможа прыпыніцца і застыць у буржуазнуй хвормя. Нідзе так, як у Гэрмані, ня накіпела шмат злосьці працоўнікаў супроць абірайцаў-грашаўнікоў; бадай ні адна страна ня абяднела так упутрана, калі можна сказаць, да мозгу, як тая ж Гэрманія; ні адзін урад і ні адна буржуазія ня высмактала так кроў працоўнікаў, як няменкія Круппы. І аддаць назаўсёды уласьць у рукі гэтае буржуазіі і яе падлізьнікам-сацыялістам, каб яна ізноў валадала, нажывалася і спаганяла бязмерныя патраты, зробленыя на вайну і праз вайну, гэрманскі пралятарыят ня згодзіцца ніколі. Іон ня захоча быць у прыгоня, і сучасная адолеўня буржуазіі хутка мінецца; гэрманскі пралятарыят скіня абломкі грашаўнаго аджыўшаго і падгніўшаго буржуазнаго устрою з яго Установным Зборам.

М. Шч.

Вялікая Польшча.

Польская буржуазея, добра адведаўшая на сабе усю хараство расейска-нямецка-аўстрыяцкаго імпэрыялізму, як толькі іой удалося трохі выбрацца на волю, сама выказала няпамерны імпэрыялістычны апэтыт. Няпамерны і нават бязсэнсоўны, бо яе дамаганьня ня толькі што ня адказваюць патрэбам польскаго працоўнаго народу, але нават ня вымагаюцца і патрэбамі самае польскае буржуазеі. Яна кіруяцца ня столькі якімі-колячы рэзонамі, сколькі жывым прыкладам сваіх старэйшых сіостраў: французкае і ангельскае буржуазеі: «Бяры, што толькі можна узяць!»

І мы бачым, што польская буржуазея зьвяртая свой прагавіты погляд і працягвая свае заграбастыя рукі на усе чатыры бокі сьвету. Больш як сто год стагнала яна пад чужым уціскам. Калі вяліканы сярэдня і усходня-эўропэйскаго захопнічства, — Нямеччына, Аўстрыя і царская Расея, абвалілся, падбітыя усясьветнаю вайною, польская буржуазея пасьпяшыла скарыстаць падходны момант і кінулася «вызваляць сваіх братоў». Пры гэтым яна ухітрылася знайсьці палякаў там, [illegible] ня было. Але гэта нісколькі ня трывожыць польскіх шовіністаў. З ловкасьцю цыркавога фокусьніка, альбо [illegible] шуллера яны высоўваюць наперад то адну, то другую мерку, зважаючы толькі на тое, якая з іх будзя карыснейшай у данны момант. Падымаяцца [illegible] этнаграфічных прынцыпах,—імі выцягваяцца на сьвет «мапа людносьці польскаеі» з бязсорамна сфальшованымі лічбамі; заходзіць гутарка аб гістарычнуй [illegible]сьці тых ці іншых земляў,—імі пускаяцца у ход «мапа гістарычнай Рэчы Пасполітэй».

Прыкрываючыся гэтымі мапамі, як фігавымі лісткамі, сучасны польскі урад [illegible] «гісторычнай місіі народу польскаго» [illegible] у нямецкія землі і у прыгранічныя [illegible] у украінскую частку Галічыны, на [illegible] у Літву і у нашую [illegible]. Але польская буржуазея ня [illegible] размяркавала добра сваіх сілаў. У Познані і у Галічыня яна напаролася на [illegible] супраціўленьня немцаў і украінцаў. Атрымаўшы часовую пераваґу над украінцамі, польскія легіоны забралі Львоў і Перамышль, але хутка былі вымушаны прасіць падмогі да абароны. Кракаускі [illegible] зьвярнуўся аб падмозя да Варшаўскаго Ураду. Той і рад быў бы памагчы, але рукі кароткі. Нядаўна было урачыста абвешчана аб злучэньні Усходняе Галічыны з Украінскай Народнай Распублікай. Увязвацца у барацьбу са усей Украінай Варшаўскі урад ня мая сілы. У бязсільнуй злосьці на свае няўдачы, польскія легіанеры накінуліся на жыдоў. Пагромы, якія адбываюцца цяпер у Галічыня узварушылі весь сьвет, і да Кракаву прыяжджала спэцыяльная амэрыканска-французкая камісія. Заданьням яе было яшчэ і адшуканьня дарогі да прымірэньня паміж палякамі і іх суседзямі: украінцамі, чэхамі і немцамі.

Паміма жаданьня прыпыніць дарэмная і бязсэнсоўная праліцьцё крыві, прадстаўнікамі Дзяржаў згоды кіравала і другая думка. Факт істнаваньня Работніцка-сялянскай Расеі няпакоіць іх, як косьць у горля. Яны прагуцца да яе зьнішчэньня, але шмат дзеля якіх прычынаў, ня могуць напусьціць на яе сваіх арміяў, і хочуць выкарыстаць дзеля гэтае мэты польскія лягіоны. Вось чаму ня да спадобы прадстаўнікам хаўруснаго капіталізму усе гэтыя непаразуменьня палякаў з украінцамі, чехамі і немцамі. Яны дакляруюць польскуй буржуазеі абарону яе дамаганьняў на мірнум конгрэся, але за тоя патрабуюць ад яе далажыць усю сваю стараньня на барацьбу з Радаваю Расеяй. Зьнішчэньня бальшавізму, які пагражая яе панаваньню, іосьць гэтак сама гарачым жаданьням і польскае буржуазеі, і яна з вялікаю ахвотаю згаджаяцца на прапазіцыю хаўрусных дзяржаў. Толькі заплату за гэта яна патрабуя няпамерную. Як піша швайцарская газэта „Нэуэ Цюрыхэр Цайтунг“ польскія делягаты намереваюцца патрэбаваць ад мірнай конфэрэнцыі перадачы Польскуй Дзяржаве тэрыторыі у 405 тыс. квадр. кілиомэтраў з насяленьням у 38 мільіонаў. Калі узяць пад увагу, что бывшая расейская правінцыя „Царства Польская“, мела тэрыторыю толькі каля $118\frac{1}{2}$ тыс. квадр. кіліомэтраў, дык нават далічыўшы сюды польскія часткі Пазнані і Галічыны, станя ясным, што польскія аннэксіоністы дамагаюцца захапіць чужую тэрыторыю, па вялічыні роўную самой Польшчы. Нам няведама дасканала, на якія мейсцовасьці прэтэндуюць польскія захопнікі, але можна думаць, што яны прагуцца захапіць усю Познань, Сілезію і Галічыну; Самыя-ж найбольшыя аннэксіі яны думаюць зрабіць на усходзя, коштам нашае бацькаўшчыны—Беларусі. Гэтая-ж самая швайцарская газэта перадае, што палякі патрабуюць сабе Гродні, Вільні и Мінску, альбо, іначай кажучы, усяе Заходняе Беларусі. Гэтая небяспека, [illegible] нам-беларусам, павінна абудзіць у нас кіпучыя энэргіі да змаганьня з [illegible] польскаю буржуазеяю.

Але апэтыт польскіх захопнікаў не абмяжоўваяцца беларуска-украінскімі землямі, і у сваіом пражэньні захапляць усіо, што кепска ляжыць, яны дайшлі да ядуна бязсэнсіцы. Польскія шовіністычныя газэты выступілі з запатрабаваньням для Польшчы каліоніяў у Афрыцы (!). Як яны лічаць, да Польшчы павінна адыйсьці часьць бывшых нямецкіх земляў у Афрыцы, вялічыніою ня меньш, як 100 тыс. квадр. кіліомэтраў і хоць з адною гаваняй. Што належыцца да лямантацый польскае буржуазеі аб яе гістарычных правох на усходзя,—дык мы яе дужа добра разумеям. Але на якога чорта патрэбны іой каліоніі у Афрыцы? Каб мець заморскія каліоніі і весьці з імі гандаль, — трэба мець свае марскія гавані і свае караблі. Тымчасам Польшча дагэтуль ня мела выхода к мору. Цапер яна, можа, і атрымая права карыстацца Данцыгам, нараўне с немцамі, але марскіх караблёў у яе усіо-ж такі няма. Даляй, польская прамысловасьць і перад вайною ня магла нават і думаць аб конкурэнцыі з ангельскаю альбо нямецкаю; цяпер же уся Польшча разбурана вайною і ад яе прамысловасьці застаўся толькі успамін. Нават, калі яна і ачухаяцца ад пасьледаў вайны, дык за мора іой перціся няма чаго: хаця бы яна справілася з задавальненьням патрэбаў свайго уласнаго і бліжэйшаго да яе беларуска-літоўскаго рынку. Адгэтуль зусім ясна, што каліоніі Польшчы патрэбны, як сабацы пятая нага. Але польская буржуазея кіруяцца толькі прыкладам старэйшых. Старэйшыя яе апякуны, Англія і Францыя займаюцца аннэксіямі,—значыць, і іой трэба рабіць тоя-ж самая; Англія і Францыя маюць каліоніі, — значыць, і Польшча павінна мець. Але польская буржуазея ня бачыць розьніцы паміж сабою і ангельска-французскаго буржуазеяю і сваімі пядавумнымі дзеямі толькі злуе іх. Англія і Францыя захаплялі нямецкія каліоніі зусім ня дзеля таго, каб аддаць іх Польшчы; яны патрэбны ім самым. Можна быць пэўным, што каліоніяў польскія імпэрыялісты ня убачаць, як сваіх вушэй. Але уся гэтая гісторыя ярка абрысоўвая той шал захопнічства, які агарнуў цяпер польскую буржуазею. Яна скача, як шалёная, яна проста сама ня ведая, чаго яна хоча. Няхай скача, хутка даскачаецца да свайго канца.

Павал Любецкі.

Камуністычны інтэрнацыанал.

Посьля таго, як працоўны народ ясна зразумеў свае мэты і дарогі да свае лепшае будучыны, ва усіх прамысловых краіох Эўропы пачалося упартая змаганьня работнікаў са сваімі ворагамі—грашаўнікамі, якія будавалі сваю асабістая шчасьця на нядолі усяго працуючаго люду. Цяжкі быў пачатак гэтае барацьбы, бо сілы былі вельмі няроўныя. З аднаго боку была невялікая, але моцная хаўрус грашаўнікоў — прамыслоўцаў, асьвечаная і узбраіоная усімі заваіовамі навейшае навукі, валодаўшая вялікімі капіталамі і у дадатак карыстаўшая з падмогі дзяржаўнаго ладу,—а з другога боку вагромністая, але цёмная і маласьвядомая маса працаўнікоў, уся маетнасьць каторых была захована у іх мазольных руках. Кожны працаўнік, узяты сам па сабе, асобна ад другіх, быў ноль, альбо блізка што ноль, і аб змаганні са сваім прыгнятацялям—капіталістам яму было нельга і думаць. Іон быў правя што жабрак, іон ня меў жадных запасаў на будучыню і карміўся толькі з работы, якую даваў яму капіталіст фабрыкант. Калі іон адзін асьмеліваўся выступіць проціў свайго гаспадара, дык той проста ня даваў яму работы і працаўнік, ня маючы заработку, мусіў альбо паміраць з голаду, альбо пакарацца свайму прыгнятацялю фабрыканту. Правадыры работніцкаго клясу добра разумелі, што пакуль работнікі будуць распыляны, пакуль яны ня будуць злучаны у адзін моцны хаўрус,—датуль яны толькі як мухі будуць бязсільна біцца і гінуць у цяніотах павукоў—капіталістаў. Першым пунктам у тактыцы работніцкаго клясу была пастаўляна як найшырэйшая абъядпання працуючых дзеля агульнаго змагання з агульным ворагам.

Найгалоўнейшым спосабам барацьбы работнікаў з фабрыкантамі зрабіліся забастоўкі. Калі гдзе-колячы варункі працы станавіліся надта дрэннымі, дык усе работнікі разам кідалі працу. Фабрыка альбо завод астанаўліваўся, і грамы [illegible] ад гэтаго вялікія страты. [illegible] сваімі работнікамі і палепшаць варункі працы, падвышаць заплату.

Капіталісты убачылі, што абъеднаўшыяся работнікі—гэта моцны вораг іх панаваньня і таксама пачалі злучацца дзеля супольнай барацьбы з работнікамі. Калі у аднаго фабрыканта астанаўлівалася фабырыка дзеля забастоўкі работнікаў, дык другія фабрыканты стараліся памагчы свайму суседу, бо яны ведалі, што тым яны намагаюць ня толькі яму, але й сабе: Калі здаралася забастоўка у ангельскіх прамыслоўцаў, дык ім прыходзілі на падмогу бэльгійскія і французкія і наадварот. Капіталісты розных краіоў злучаліся, каб супольна змагацца з работніцкім рухам.

Такоя з'явішча міжнароднай еднасьці капіталістаў паставіла на парадак дня і міжнародная абъяднання работнікаў. І такія пробы сталі усамдзеля рабіцца: першая міжнародная абъяднання работніцкіх партый розных эўропэйскіх краіоў было заложана стараннямі Карла Маркса, гэніальнаго правадыра работніцкаго класу. Паняцце „Міжнародны“ на усіх эўропэйскіх мовах выражаяцца словам „інтарнацыанальны“, і вось, інтарнацыанальная абъяднання работніцкіх партый, заложана Марксам, сталі дзеля караткасьці называць проста „інтарнацыаналам“. Гэта была першая проба міжнароднаго абъяднаньня работніцкаго клясу, альбо „першы інтарнацыанал“. Але шмат нясьвядомасьці было яшчэ у работніцкіх масах розных краіоў, і звязак гэты ня пратрываў доўга, першы інтарнацыанал рассыпаўся. Але патреба у міжнародным абъяднанні працуючых пачувалася ужо даволі гостра і праз чвэрць веку посьля першаго інтарнацыаналу, у 1889 годзя быў заложаны другі інтарнацыанал, які пратрываў да пачатку усясьветнае вайны.

Усясьветная вайна узбурылася дзеля таго, што капіталісты розных краіоў парашкаджалі адзін аднаму багацець і набіваць свае кішэні. Напрыклад, нямец-

В Белоруссии.

Впечатления.

Могилев—Губернский. Один из культурных центров Белоруссии.

На главной улице людно и шумно.

По мостовой стройными рядами двигаются отряды Красной Армии. Открытые, молодые лица. Красиво пригнанные шинели. Винтовки. Красные звездочки на фуражках. Вольная поступь. Смотришь, и как-то радостно делается на душе.

Впереди оркестр играет марсельезу.

На тратуарах глазеющая публика. Преобладают рабочие. Сравнительно много интеллигенции... Бобровые воротники и самодовольные лица с тройными от жиру затылками отсутствуют. Сбежали...

Публика любуется красноармейцами, делится впечатлениями. Шутки, говор, смех.

— Ей-Богу, молодцы,—восхищается истертый тулуп.—Едут вот... И нажмут. Не дать...

— Кого нажмут?

— Немца и гайдамака... На Гомель идут... Понравился городишка, никак отдать не хотят...

Бородатый, весь в саже, рабочий—как видно, слесарь или кузнец,—блестя белками глаз путанно и пространно высказывает окружающим свои убеждения.

— Рассуждение касательно чего здесь? Рабочему человеку должны быть все права предоставлены. Единственно он свет держит... и фабрики, и постройки разные, и железныя дороги, и всякие предметы... Куда не поверни—все рабочий. Значить, и давай ему жизнь самую настоящую. А не хотишь:—двигай сюда революцию... будем воевать...

И вдруг совсем неожиданно хлопнул мозолистой ладонью по шапке, сбил ее на бок и выпалил:

— Хорошо!..

— Что хорошо?

— Дело это рабочее...

Кто-то засмеялся...

Рядом тоненький, весь в веснушках, гимназистик, срывая трепанную фуражку, закружил ее колесом и звонко закричал:

— Да здравствует Советская власть! Да здравствует диктатура пролетариата!..

— Ах, ты, малышь этакий...—ворчит около меня седая борода.

На углу толпа окружила деревенского деда с полотняной сумкой через плечо.

— Другая полоса началась: тут и говорить нечего,—повествует дед.—Немец жилы вытягивал. Ему все подай. А поляки того похуже. Не приведи Бог. Легионеры эти прямо на головах ходили у нас. Никакой удержки небыло им. На смерть засекали шомполами. Грабили. Убивали... Помещики эти самые тоже расчухались было. Думали, [illegible] старое повернуть. Ан, вышло иначе. [illegible] всех... Теперь, как по маслу, [illegible]. Совет выбрали. Арендатора по [illegible] землю к себе. Хлеб, ежели у кого [illegible] росписку. Самогонку вон из [illegible]... Мобилизация пришла—парни в красную армию... Дело закипело...

— А хлеба нам все таки не везете...—язвительно заметила старуха в затасканном полушубке.

Дед разобиделся:

— Как это по вашему... а немец позволял нам везти хлеб до города... Все дадим, только порядок немного заведем...

Гремит Марсельеза и заполняет победными звуками морозный воздух... На небе ласковое, зимнее солнце... Как угорелые носятся над крышами крикливые галки. Как видно, им тоже радостно...

И чем-то далеким и забытым кажется в эту минуту та полоса Могилевской жизни, когда здесь, творя на каждом шагу злодейство и насилие, хозяйничали польские легионы и немецкие оккупационные власти.

И невольно хочется, по примеру рабочего, испачканного в сажу, хлопнуть себя по шапке, сбить ее на ухо и сказать:

— Хорошо!..

Боровик.

— прамыслоуцы выраблялі гэткія ж тавары, як і ангельскія. Нямецкія прамыслоуцы былі зацікауляны у тым, как як больш нарабіць і збыць сваіх вырабау. І гэтум жа былі зацікауляны і нямецкія гандляры, якія гандлявалі гэтымі вырабамі. Ангельскія-ж прамыслоуцы і ангельскія гандляры былі зацікауляны у тым, каб як найбольш вырабіць і збыць ангельскіх таварау. Дабіцца пяравагі над сваімі працуінікамі мірным спосабам было нельга, і ушчалася вайна. Урад ва усіх краіох быу капіталістычны: кожны міністар, альбо другі важны чыноунік адначасьня быу і прамыслоуцам, трымау акцыі якога-колячы прадпрыемства свайго краю. Няма нічога дзіунаго, што расейскія царскія міністры гаварылі аб зваяванні Нямеччыны, нямецкія—аб пярамозя над Англіяй і гэтак даляй, Але працоуны народ усіх краіоу ані крыхі ня быу зацікауляны у вайне. Яму было усяроуна, у чыю кішэню пойдзя прыбытак, ці у кішэню ангельскаго містэра Вулфа, ці у кішэню нямецкаго гэрра Вольфа. Значыць, ясна, што работніцкі кляс і яго правадыры павінны былі паустаць процiу гэтае братабойнае вайны.

Тым часам выйшла ня гэтак. Правадыры работніцкаго клясу здрадзілі яму і парайшлі на сторану яго ворагау—капіталістау. Нямецкія сацыалісты падтрымалі свой урад і сацыялістычныя дапутаты рэйхстагу падалі свой голас за ваенныя ассыгноукі, у Францыі-ж і Бэльгіі сацыалісты дайшлі да таго, што іх прадстаунікі Вандэрвэльдэ і Тома былі нават міністрамі. Чаму гэтак? Французкім работнікам тлумачылі, што Нямеччына хоча зрабаваць і падняволіць Францыю, і што яны павінны абараняцца; тоя ж самая гаварылася і расейскаму працоунаму народу і ангельскім, бэльгійскім і італьянскім работнікам. Нямецкім жа работнікам гаварылі, што усе суседнія дзяржавы толькі і думаюць аб тым, каб звясьці Нямеччыну са сьвету і што іх павіннасьць абараняць аб загубы сваю бацькаушчыну. І выходзіла нейкая крывавая блутаніна: усе абараняліся, а хто-ж нападау? Ня гледзячы на яуную бязсэнсіцу гэтаго, капіталістам удалося атуманіць працоуны народ сваіх земляу і паслаць яго на братабойную вайну. Усіо было на службе капіталістау: урад, друк, папоуства, школы і паліцыя. Газэты друкавалі гарачыя артыкулы аб абароня бацькаушчыны. папы гаварылі казання на патрыотычныя тэмы і маліліся аб „дараванні пабед“ воінству свайго краю. Калі-ж знайходзіуся разумны і адважны чалавек, які хацеу разсеяць гэты туман і выступау процiу вайны, дык паліцыя хутка запратвала яго за турэмныя сьцены. Гэтак быу засаджаны на увесь час вайны сьветлай памяці Карл Лібкнэхт, адзін з нямецкіх сацыалістау паустаушы процiу вайны.

Другі інтарнацыанал рассыпауся. Сацыалісты паасобных краіоу апрабавалі братабойную палітыку сваіх урадау і памагалі ім пасылаць работнікау на поля сьмерці. Толькі расейская партыя большэвікоу на чале с таварышам Леніным заусягды была процiу вайны. Але уся партыя складалася з нявялічкаго гуртка людзей, адрэзаных ад Расеі, а у самой Расеі цяжкая рука мікалаяуской паліцыі нішчыла усе праявы вольнай думкі.

Скончэньня вайны ясна паказала, што пазіцыя расейскае камуністычнае партыі (большэвікоу) была справядлівая, і што буржуазея усіх краіоу толькі і думая аб рабленьні другога краю і аб душэнні працоунаго руху як у варожным краю, так і у сваіом уласнум. Дзеля гэтаго перад працоуным клясам усяго сьвету паустае няадкладная патрэба аб'яднання. Расейская Камуністычная Партыя (большэвікоу) зьвярнулася да работнікау усяго сьвету с клічам да інтарнацыанальнаго аб'яднання, да збудавання „Трэцяго інтарнацыаналу“. Работнікі усіх краіоу прызываюцца прысланць сваіх прадстаунікоу дзеля агульнай парады аб далейшых заданьнях працуючых. Але на гэтую параду работнікі усяго сьвету павінны прыслаць праудзівых сваіх прадстаунікоу, а ня прыслужнікау буржуазеі. На работніцкуй парадзя ня павінна быць мейсца Шэйдэманам і падобным яму сацыал-прадаунам, якія ходзяць на задніх лапках перад буржуазеяй і па яе загаду расстрэльваюць работнікау. Новы інтарнацыанал павінян быць камуністычным інтарнацыаналам, і на праэктуямую конфэрэнцыю павінны будуць сабрацца толькі прадстаунікі сацыалістычных партый, блізкіх па духу да Расейскае Камуністычнае Партыі. якія ня запляміді сябе прыслужнічаньям буржуазеі.

Склікаямы інтарнацыанальны сацыялістычны конгрэсс мая асаблівую вагу для нас беларусау. Усе папярэднія міжнародныя конгрэсы сацыалістычных партый, складаліся толькі с сацыалістау тагашніх нязалежных дзяржавау. Наш беларускі народ ня меу свае дзяржаувы, быу „ндзяржауным“, і яго прадстаунікоу ня было ні на якіх міжнародных сацыалістычных конгрэсах. Цапер жа у звязку з эгалашэньням нязалежнае Беларускае Радавае Распублікі, на праэктуямую конфэрэнцыю запрашаяцца і прадстаунік ад беларускіх камуністау. Першы раз у сваіой гісторыі беларускі працоуны народ зможа голасна, на увесь сьвет выказаць сваі патрэбы і дамаганьня.

Міхась Баравы.

Беларусізацыя школау Беларускае Камуны.

(Гл. №№ 46 и 47).

Згадзіушыся прынцыпіальна з беларусізацыяй, трэба аглянуцца наукруг і добра абмяркаваць, праудзіва падлічыць, ці знайдзяцца у нас, беларусау, столькі культурных працаунікоу, каб яны здолялі правесьці у жыцьцё поуную беларусізацыю школы; ці будзя у нас столькі культурных сіл і матэр'ялу, каб мы маглі павесьці беларусізацыю зразу па усіх фронтах школы: І-й прыступкі, ІІ-й і школы спэцыяльнай?

Калі падвесьці падрахунак усім беларускім сілам на школьнуй глебя, дык мы пабачым, што іх ня занадта ужо многа. Працаунікау у вышэйшуй школя—дзесятак-другі, у быушых сярэдніх тоя самая; у пачатковых школах іх больш, але яны нявргатізованы, распыляны і быць актыуна-ініцыатыунымі працаунікамі ня змогуць; маса нашаго вясковаго вучыцяльства выйшла з сэмінарый Аляксандра ІІІ-го; Мікалая другого; яно і атрымала там адукацыю, каб глауным чынам змагацца з беларускім рухам, «с краевыми сепаратистскими тенденциями»; спадзявацца на іх пякім родам ня можна. Прауда, цяперашняя вучыцельства стаіць на распуцці, яно ужо убачыла сваю ранейшую памылку, але, каб перацягнуць яго дзеля працы на роднуй глебя, трэба яго перакапаць, пераканаць назаусягды.

Матэр'ялу дзеля пазучання у беларускуй мовя зусім мала; калі ня лічыць 5—10 падручнікау для пачатковай школы, бадай што зусім няма. Дзеля быушых сярэдніх і цяперашніх вышэйшых навуковых інстытуцый навучна беларускаго ня знойдзяцца нічога. Тут яшчэ ня пачаты край працы.

Усіо гэта прымушая беларусау дамагацца толькі часьціннай беларусізацыі. Беларускі культурна-нацыянальны рух быу выкліканы самім жыццiом, у першуй пары свайго развіцця, да «эпохі Рады», іон быу пчыра-дэмакратычны, народны, чужы усякаму шавінізму. Беларускі Нац. Камісарыят вядзе беларускі рух па шляху сацыалістычнаго будавання, у яком нічога я повінна быць супроцьжыццiоваго, няпраудзіваго; беларусізацыя школы. пачатлякой стаяя Бел. Нац. Кам. ня павінна тасама мець нічога няжывога, выдуманаго, штучнаго.

А таму беларусізацыю школы трэба правадзіць патроху, пастолькі, паскольці яна выклікаецца жыцціом, паскольці яна ня ідзе супроць натуральнаго ходу жыцця.

Першым доугам трэба увесьці ува усіх школах Беларускае Камуны абавязковая азнаямлення з беларускай мовай, з гісторыяй яе развіцця са усемі яе характэрнымі асобнасьцямі адначасова з гэтым павінна быць праведзена азнаямлення з беларускім пісьменствам, як старадаунім, так і повым.

Беларуская песьня, казка, прыслоу'я, звычаі, усіо тоя, што належыць да этнаграфіі,—іосьць магутная сіла, якая у школя паможа залячыць гістарычна панесяныя раны.

Геаграфія, сацыальная і канамічная становішча, гісторыя Беларусі—усіо гэта павінна знайсьці і заняць сваі мейсца у школя на Беларусі. У кожнуй навуковуй інстытуцыі Беларускай Камуны трэба сканструяваць спэцыяльны Беларускі аддзел пры бібліатэцы, у яком былі б сабраны уже кнігі, журналы, матэр'ялы па беларускаму пытанню: пра вялікую важкасьць такіх аддзелау ня трэба казаць. Бел. Нац. Кам, павінян зьвярнуць увагу на тоя, каб у кожную школу регулярна прыхадзілі перыадычныя выдання аб Беларусі.

У кожнуй школя трэба правесьці самы шырокі прынцып беларусазнауства. У гэтум, пакуль што, і іосьць часьцінная беларусізацыя школы.

Запатрэбаваньні, выказаныя тут, былі ужо выстауляны вучнямі Горэцкіх сельска-гаспадарскіх навук. інстытуцый у наказя дэлегату. Гэта сьведчыць аб тым, што пытання аб беларусізацыі досьць насьпела і патрэуя свайго вырашэння.

Беларускі культурна-нацыянальны рух у апошнія часы захоплівая усіо большыя і большыя масы, іон шпарка ідзе наперад і у гэтум паступовум ходзя іон дайшоу ужо да пытання аб роднуй школя. Пытання важкая, сур'іозная, якоя вымагая, каб над ім застанавіліся як беларускія культурна-нацыянальна-грамадзянскія арганізацыі, так і дзеячы на шляху адраджэння беларускаго народу.

Гурык Г.

Из жизни коммунистической ячейки Белорусского Полоцкого полка.

Среди товарищей-коммунистов, попавших в организующийся Белорусский Полоцкий полк, возникла мысль об устройстве в названном полку ячейки Российск. Коммунист. партии.

14-го января состоялось организационное собрание. Согласно инструкции об образовании коммунистических ячеек в красноармейских частях, была избрана комиссия для поверки партийных документов. В комиссию вошли: заместитель политического комиссара тов. Тежик и члены Комуннистической Партии — т.т. Кравченя и Куркин, которым и поручено было представить доклад о результатах поверки партийных документов к следующему собранию.

23-го января состоялось вторичное собрание. Комиссией по поверке документов было доложено, что бесспорные документы, доказывающие о принадлежности к Российской Коммунистической Партии, имеются у 16 товарищей. Всех этих товарищей постановлено утвердить членами ячейки. Вслед за тем был избран президиум в составе: председателя—тов. Тежика, секретаря — тов. Сидора, товарища председателя—тов. Туйдака и двух кандидатов к ним—т.т. Кравчени и Куркина. Решено было устраивать очередные партийные собрания два раза в неделю—во вторник и в пятницу в шесть часов вечера.

Вслед за тем было рассмотрено заявление 42 товарищей о приеме их в группу сочувствующих, при чем выяснилось, что только у двух из них имеются документы, доказывающие принадлежность их к группе сочувствующих. Постановлено было предложить т.т. заявившим о своем желании вступить в группу сочувствующих, озаботиться представлением к очередному собранию установленных рекомендаций для утверждения их членами группы сочувствующих при коммунистической ячейке Белорусского Полоцкого полка.

М. Б.

Товарышы работнікі, селяня і воіны— беларусы!

Імпэрыалістычная бойня разбурыла нашую бацькаушчыну і значную частку народу нашаго выгнала на холад і голад у чужом боку. Цяжка жывецца нашым братом — уцякачом на чужыня. Знэрвованыя, згалеушыя, пазбауляныя самых найпатрабнейшых рэчау, яны ня жывуць, але гібеюць.

Беларус прывык цярпець і покутаваць моучкі, нікому ня скардзячыся на сваю нядолю. Дзеля гэтаго нашыя уцякачы часта застаюцца бяз самаго наймалейшаго падтрыманьня і гінуць, як мухі у восянь. Заданьням нашае газэты іосьць **асьвятліць гаротная жыцьцiо беларускаго уцякача і зьвярнуць на яго увагу тых, это павінян быу бы паклапаціцца аб ім.** Дзеля гэтаго радакцыя зьвяртаяцца з прозьбаю да усіх беларусау, раскіданых па Расеі, пісаць у нашую газэту, павядамляць нас аб усіх выдатных здарэньнях у жыцьці нашых уцякачоу. Пішыця, як хто умея. Ня саромяйцяся, калі будзя няскладна напісана. Сорам на тых, хто ня давау нам вучыцца, трымау у цямнаце народ наш.

Беларусь ачышчаяцца ад ворага. Стаміушыяся людзі кідаюцца да хаты, трацяць апошні грош на падарожу, дабіраюцца да свае віоскі і замест хаты застаюць адно пустоя мейсца. Набліжаяцца вясна. Трэба абрабіць, засеяць поля. А тут, як кажуць, і „рук няма за што заціць“. **Пытаньня аб належна-упарадкавануй рээвакуацыі назад на родныя мейсцы, і арганізаваньня падмогі вярнуушымся,**—так сама клапоціць нас. Радакцыя просіць усіх таварышау, знаіомых с ходам рээвакуацыі, пісаць да нас, на страніцах нашае газэты выказваць свае думкі аб тых зьменах і палепшаньнях, якія патрэбны у гэтуй справя. Усіо грамадзянства нашая павінна быць асьвядомляна аб тым, што робіцца і што яшчэ трэба зрабіць дзеля вазстановы жыцьця у нашуй разбурануй бацькаушчыня.

Зломаны стары парадак. Ідзе будаваньня новаго жыцьця. Па усіх немаль гарадох Расейскае Распублікі іосьць беларускія камуністычныя сэкцыі і бежанскія арганізацыі. Яны працуюць над усьвядамленьням беларускаго працоунаго народу аб яго заданьнях і аб дарогах да яго лепшае будучыны. Але праца гэтая ідзе раскідана, у кожнум мейсцы па-свойму; адны ня ведаюць, што робяць другія; ня хапая зьвязку і узаемнай дапасованнасьці працы. **Нашая газэта,** — ядыная беларуская газэта на тэрыторыі Радавае Расеі,—і яна **павінна стацца асьвядаміцяльніцай беларускіх гуртко у, сэкцый і арганізацый аб працы ім падобных.**

Дзеля гэтаго, усе таварышы, працуючыя над усьвядамленьням працоуных масау народу Беларускаго на тэрыторыі Расейскае Распублікі, павінны прысылаць нам матар'ялы, датычныя духоунаго жыцьця беларусау на чужыня: весткі аб школах, клюбах, курсах, сходах, зьездах, гурткох, сэкцыях, таварыствах, прысылаць нам свае пратаколы, пастановы і разалюцыі. Нашая газэта павінна знайходзіцца ва усякуй беларускуй арганізацыі, у кожнум беларускум гуртку; кожны сьвядомы беларус павінян дбаць аб яе пашырэньні сярод беларускіх працоуных масау. Толькі тагды яна зможа стаць жывою духоунаю злукаю паміж усімі беларусамі, раскіданымі па Расеі.

Нашыя браты на бацькаушчыня, збавіушыся ад прыгону нямецкіх разбойнікау і польскіх кравапіуцау — паноу, пачалі будову новае, вольнае Работніцка-селянскае Беларусі. Праклямована Беларуская Радавая Распубліка са сваім Беларускім Урадам. Адгэтуль ня хто-небудзь чужы будзя кіраваць доляю нашае гаротнае Беларусі, але яе уласныя сыны. **Нашая газэта будзя пільна сачыць за працаю Беларускаго Работніцка-селянскаго Ураду і павядамляць аб іой усіх нашых братоу беларусау, каго доля трымая яшчэ на чужыня.**

Але ня усіо яшчэ ясна на беларускум небасхіля. Чорныя хмары паузуць на нас з захаду і награжаюць схаваць сонца нашае вольнасьці. Шляхэцкая Польшча карыстаючыся спагадаю і падтрыманьням заходняэуропэйскіх разбойнікау, хоча падняволіць нас, ізноу пасадзіць нам на карк кровапійуцау-паноу, якіх мы толькі что выгналі са свае зямелькі. **Мы будзям асьвятляць і кляймаваць тую ганебную работу, якую вядзе процiу нас польская шляхта у хаурусе з сацыал-прадауцамі, здраднікамі працоунаго народу.**

Работы процьма, і усе сьвядомыя сыны беларускаго працоунаго народу павінны памагчы нам. Яны мусяць „узяць сваю справу у свае рукі“, і толькі тагды яна пойдзя спрауна і гладка.

Радакцыя.

Аб усім па троху.

З Беларусі.

Пасол Беларускай Рады на Украіня.

Рада Беларускай Народнай Распублікі назначыла Аркадыя Смоліча, сябра Рады Народных Міністрау надзвычайным паунамочным паслом Беларускаго Ураду пры Урадзя Украінскай Народнай Распублікі. (Гоман).

Заява Рады Народных Міністрау Беларускай Народнай Распублікі.

Газэта «Дзеннік Віленьскі» у № 297 ад 21 дзякабра 1918 г. друкуя гэткую вестку бюро прэссы польскаго міністэрства заграпічных спрау.

«Да Берну прыехала далягацыя Беларускай Рады, зложаная з гр. Лубенскаго, гр. Пуслоускаго і п. Рыбінскаго, якая, маючы ракамандацыі ад польскаго ураду, была прыпята коаліцыйнымі пасольствамі. Гр. Лубенскі пасьля трохдзеннай бытнасьці у Бэрня, выяхау у Парыж. Бытнасьць далягатау Беларускай Рады можна мець вялікую вагу, бо прыехалі яны у момант грознай нябаспекі для літоускабеларускіх зямель і прывязьлі значны матар'ял фактычны, а іх погляды, дакладныя і умяркаваныя, бяз сумлявання будуць сур'озна прыняты пад увагу у кругах, прызваных да развязкі усходніх спрау».

Рада Народных Міністрау Беларускай Народнай Распублікі афіцыальна заяуляя, што ніводзін с трох памянутых польскіх паноу ня належыць да складу заграпічнай далягацыі ані Беларускай Рады у Вільні, ані Рады Распублікі у Менску і ніякіх мандатау ня мая. Калі-ж яны выступаюць заграніцай, як «далягаты Беларускай Рады», дык гэта звычайная палітычная самазванства. (Гоман).

Міравыя судздзі у Гродзянскуй губэрні.

Назначаны за міравых судздзяу і упаунаважаны прыняць ад нямецкіх судоу справы, дакументы, кнігі, грошы, інвэнтар і т. д.: Яугень Аугустыновіч — у Гродні, Мікалай Янкоускі — Гродзянскі павет, Вітольд Валькоускі — у Беласток, Вацлау Конашынскі—у Беластоцкі пав., Іван Былінскі — у Белавежскі, Шэвель Сьліозбэрг—у Ваукавыскі, Міхаіл Янкоускі—у Сакольскі і часова у Аляксіцкі, Фэлікс Мілеускі—у Плянцкі (Шчучынскі), Васіль Курносау — у Дзятлаускі і Антон Каушун—у Лідзкі.

Названым міравым судздзям загадываяцца часова спауняць чыннасьці судоваго сьледчаго у тых паветах, у якіх яны назначаны міравымі судздзямі. Яны павінны ураз жа прыняць ад нямецкіх судздзяу судовыя справы і прыступіць да спаунення сваіх абавязкау. (Гоман).

Новая беларусская газэта.

У дайшоушум да нас № 101 «Гоману» за 24—XII надрукована абвестка, што с 1-го январа 1919 году у Вільні пачне выходзіць штодзенная беларусская газэта «Ніоман».

Выхад з Тарыбы І Луцкевіча і І. Станкевіча.

У № 101 «Гоману» надрукаваны гэткі ліст да радакцыі:

Мы, ніжэйпадпісаныя, ня лічучы магчымым дзеля прынцыпіальных прычын у звязку з апошнімі крокамі літоускаго ураду і прэзыдыуу Дзяржаунай Рады (Тарыбы) даляй аставацца у складзя апошняй, гэтым падаем да агульнаго ведама аб нашум выхадзя з Тарыбы.—Іван Луцкевіч, Іван Станкевіч.

Тарыба і Рада.

У Коуні адбудзяцца парада прадстаунікоу Літоускае Тарыбы і Беларускае Рады дзеля больш цеснаго аб'яднання іх працы.

Пастанова Беларускаго гуртка „Зарніца“.

Выслухаушы даклады тав. П. А. Зенюка і М. Стагановіч аб сучаснум палітычнум момэнця, мы, сябрукі культурна-прасьветнаго гуртка «Зарніца», аднагалосна зрабілі гэткую пастанову:

Быушая буржуазная Беларуская Рада, якая складалася з паноу-ляхау, папоу, ксяндзоу і сацыал-згоднікау, ня выяуляла волі працоунаго народу і ня дакладала старэньня аб паляпшэнні яго жыцця.

Мы, дзеці працоунаго народу, вітаям Часовы урад працоунаго народу Беларускае Радавае Сацыалістычнае Распублікі і будзям, колькі змога, яго падтрымоу-

ваць, спадзяючыся, што Часовы Урад ня дасць у крыуду зняважаную, спаляндраваную Матку-Беларусь; даложыць працы у напрамку культурна-эканамічнага адраджэння Бацькаушчыны.

Старшыня гуртка: А. Колпак, Тав. старшыні: П. Зенюк, Скарбнік: А. Боборэко, Пісар: А. Оніхоускі, Тав. пісара: Л. Зенковіч.

14 студня 1919 г. в. Старыца, Слуцкаго пав., Мінскае губ.

Беларускі Урад аб забойсцьвя Лібкнехта.

Прэзыдыум Часоваго Ураду Беларусі паслау Нямецкуй камуністычнуй партыі спартакаўцау гэткую тэлеграму:

«Часовы Работніцка-Сялянскі Урад Беларусі, засмучаны зьверскім забойствам Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург, пасылая праклящця беларускіх работнікау і батракоў буржуазнаму сьвету і полымя сацыял-праўдцам, пасягнуўшым на жыццё сьветлых правадыроў нямецкага работніцкага класу».

Ваенна-равалюцыйная Рада Беларускае Распублікі.

На засяданьні Беларускаго Радаваго Ураду пастаноуляна арганізаваць Ваенна-равалюцыйную Раду Беларускай Распублікі. У склае яе увайшлі тар.: Мясьнікоу, Алібекау, Красікоу, Селезнеу і Цыжоу.

Дзецям Петраграду.

Камісарыят харчевых спрау Беларускай Распублікі пастановіу нябауна паслаць у Петраград 50 вагонау картофляу і 5 вагонау іншых харчу. Гэтак сама паслана некулькі вагонау хлеба Петраградзкім дзецям.

Вазстанова жалезнадарожнаго руху.

Вечарам 25-го января да Вільні прыйшоу першы поязд з Мінску па пярашытуй дарозя. Пакуль што ходзяць толькі воінскія і служэбныя паязды. Вядзецца сьпешная пярашыука дарогау на Баранавічы і на Дзьвінск.

Школьная сьвята у Магілевя.

Дзеля адчыненьня працоуных школау, у Магілевя 28 января адбылося школьная сьвята. Усе школы былі дэкараваны зеляняй, а іншыя будынкі-чырвонымі штандарамі. Вучні з пеяньням равалюцыйных песьняу стройнымі радамі прайшлися па месьця.

Унівэрсітэт у Смаленску.

У № 19 (571) «Известий В. Ц. И. К.» надрукованы дэкрэт Рады Народных Камісарау Расейскае Распублікі аб зацьвярджэньні унівэрсытэтау у Кастроме, Смаленску, Астрахані і Тамбовя, заложаных у памяць Акцябарскае равалюцыі. Першым дніом іх істненьня пастаноуляна лічыць дзень першых гадавін Акцябарскае равалюцыі—9-го наябра 1918 года.

Выдзяленьня Вітабскае губ.

Чацьверты зьезд радау Вітабскае губ. пастанавіу выдзяліць Вітабскую губэрнію з Беларускае Распублікі. На зьездзя был каля 150 далягатау; з іх толькі 2 левых эс-эра, 9 безпартыйных, а рэшту камуністы і ім спагадаючыя.

У Расейскуй фэдэрацыі.

Аб'яднання Украйны і Усходняй Галічыны.

Украінская Дырэкторыя апублікавала гэткая павядамлення: „згодна з пастановаю Нацыянальнай Рады Заходняй Украінскай Народнай Распублікі у Кіявя агалошана 22 января аб'яднання украінскіх земляу бышае Аустрыйскае Імпэрыі з Украінскаю Народнаю Распублікаю у адну суцэльную сувэрэнную Украінскую Народную Распубліку. Акт аб'яднання быу агалошаны на Сафійскум пляцу пры надзвычайнум зборышчы народу і выклікау аграмадны энтуазіазм. Після акта адбыуса парад украінскаго войска і лічэбныя маніфэстацыі — Ад імяні Дырэкторыі Чэхоускі“.

Урад Украінскае Радавае Распублікі.

Услад ураду Украінскае Радавае Распублікі уходзяць т. т.: Прэзыдэнт і Народны камісар чужаземных спрау—Ракоуські; Совнархоз Украйны—Пятакоу, Квірінг, Рухімович; Наркомы ваенных спрау—Падвойскі і Межлаук; ра авай прапаганды—Арцем; унутраных спрау—Аверын і Ворошылоу; народнай прасьветы — Затонскі; зямляробства—Колегаеу; справядлівасьці — Хмельніцкі; працы — Магідоу; храчавых спрау—Шліхтэр і Бубноу; грашавых спрау—Земіт; камунікацыі—Жарко; кантролю — Скрыпнік; камандуючы арміяй Украінскае Радавае Распублікі—Антонау-Оусеенко; Ваенна — равалюцыйная рада— Антоноу-Овсеенко, Кацюбінскі і Шчадэнко.

Украіна і Вялікарасея.

У інструкцыях аб чужазенцах, выданых Урадам Украінскае Радавае Распублікі, сказана, што усе грамадзяня Расейскае Радавае Распублікі прырауноуваюцца у сваіх правах да грамадзян Украінскае Радавае Распублікі. Яны будуць прызывацца да адбываньня воінскае павіннасьці. Гэткая-ж права надаецца і Расейскаму Ураду у адносінах да украінцау.

Польскія камуністы.

Цантровы Камітэт знайходзячыхся у Расеі группау камуністычнай работніцкай партыі Польшчы пяраезжая у Вільню. Туды пяраводзіцца і радакцыя газэты „Млот“. Камуністычная агітацыя сярод польскіх працоуных масау за апошнія часы значна пашырылася.

Аб з'ездзя Р. К. П.

На засяданні Петраградзкаго Камітэту Р. К. П. было пастаноуляна хадайнічаць пярад Цантровым Камітэтам партыі аб склікванні чароднаго партыйнаго з'езду у пачатку марца месяца 1919 году. Петраградзкі Камітэты прызнае склікання партыйнаго з'езду няадкладнай патрэбай, дзеля таго, што ад апошняго з'езду прайшло ужо больш году і што за гэты час сабралася дужа шмат важных пытанняу, якія могуць быць развязаны толькі з'ездам, як найвышэйшаю партыйнаю установаю.

Латышскія белагвардэйцы.

З Лібавы павядамляюць, што некаторыя з сяброу буржуазнаго Часоваго Ураду Лацьвіі выехалі у Англію дзеля згавору з Антантаю. „Часовы Урад“ пробавау абвясьціць мабілізацыю у Лібавя і блізкіх да яе мяйсцовасьцях, але нічога з гэтае мабілізацыі ня вышла. Стральцы „Нацыянальнае Рады“ расфармоуваюцца дзеля іх нянадзейнасьці. У Лібаускуй гавані стаяць на паготовя тры параходы дзеля ад'езду сяброу Часоваго Ураду.

Резолюция Комитета Саратовской Белорусской Секции Р. К. П. (большевиков).

Принимается следующая резолюция, предложенная тов. Дедей:

Заслушав доклад т. Деди об убийстве вождя Германскаго пролетариата и мировой революции тов. Либкнехта, Белорусская секция Р. К. Р. (большевиков) приносит свое душевное соболезнование о потере из рядов Германскаго пролетариата вождя мировой революции тов. Либкнехта.

Видя тяжелое положеніе Германского пралетариата в борьбе его за диктатуру мирового пролетариата против хищников всех стран, мы комунисты — белорусы клянемся отомстить империалистам и соглашателям всех стран за убийство дорогого товарища Либкнехта и посягательства на диктатуру пролетариата и советскую власть. Проклятье мироедам!..

Безпощадная месть капиталистам всех стран!

Да здравствует мировая революция!

Да здравствует третий интернанионал!

Беларускія песьні у Вароняжскум Сельска-гаспадарскум Інстытуця.

З радасьцю прыходзіцца адзначаць паусюдная прабудженьня нацыянальнай сьвядомасьці сярод беларускай інтэлігэнцыі і цікаунасьць да беларускаго руху у прыяцельскіх расейскіх і украінскіх грамадзян. Гэта можна было прыкмеціць і у далёкум Варанежскум Сельска-гаспадарскум Інстытуця на сьвяткаваньні Таццянінскаго дня 25-го января. У названуй вышэйшуй навуковуй школя налічваецца каля тры цаці студэнтау — беларусау. На вечарынцы, гдзе сабралася шмат народу (студэнтау, прафэсароу і шмат староньніх), былі між іншымі вершамі прадэклямованы «Родны край» Якуба Коласа і «Сівер» Янкі Лучыны; хор прапеяу беларускую народную песяньку «Чаму-ж мне ня пець». Як дэклямацыя, так і сьпяваньня беларускіх рэчау узбурылі стыхійны інтарэс у слухачау. Некаторыя пасьля гаварылі, што яны і ня чулі, што беларусы маюць уласная прыгожая пісьменства і такія пекныя харавыя песьні, якія ведая і пяе нават хор Славянскаго.

Юзік Тросько.

За рубяжом.

Пахавання Карла Лібкнэхта.

25-го января адбылося пахаванпя Карла Лібкнэхта і другіх 28 ахвярау спартакаускаго мяцежа. Нязалежныя с.-д. зноу выпусьцілі адозву аб уладжаньні масавае дэмонстрацыі на Альлеі Пабеды. Аднак, Урад ня дапусьціу зьбірацца натоупам народу. Большая частка трупау была выстаулена у моргу, адкуль яны былі адвезяны на вялікіх каляcках, абабітых чырвоным. Пахавальная працэсія, ня змогшы прайсьці па Альлеі Пабеды, скіравалася на пляц Бюлова, што знайходзіцца у паупочна-усходнюй частцы Бэрліну. Там сабралася шмат дапутацыяу з вянкамі. Камуністка Рубен сказала прамову, у якой выказала пяраконаньня, што настаня час, калі улада будзя належаць да камуністау. Затым жалобная працэсія пакіравалася у усходняя прадмесьця—Фрыдрыхсфэльд, гдзе трупы і былі пахаваны.

Шукання цела Розы Люксэмбург.

«Форвэртс» павядмляя, што усе чуткі, што нібы то цяжка зранявая Роза Люксэмбург знайходзіцца у Моабіцкум шпіталі,—ня маюць жадных падставау. Цела Розы Люксэмбург дагэтуль яшчэ ня адшукана.

Як быу забіты Лібкнэхт.

З Бэрліну павядамляюць, што Лібкнэхт ранены тры у галаву, у правую палавіну грудзей і у плячо. Усе раны сьведчаць, што стрэлы былі зроблены спераду і што уцякання ня было. Стрэл у галаву, як відаць, быу зроблены зблізка.

На мірнуй конфэрэнцыі.

Мірная конфэрэнцыя пастанавіла выбраць камітэт дзеля дэталічнаго распрацаваньня праэкту аб «хаурусе народау». Прынята пастанова аб утварэньні камісіі дзеля разгляду пытаньня аб тым, хто павінен у пачатку вайны. Што належыцца да нямецкіх колёній, дык жаднае пастановы ня зроблена, бо пытаньня гэта надта вострая і цяжкая.

Нямецкая фэдэрацыя.

Новая Нямеччына будзя складацца з васьмі распублікау, якія усе разам будуць злучаны у адну фэдэратыуную распубліку на чале з прэзыдэнтам. У склад гэтай распублікі увойдзя і нямецкая Аустрыя.

Аб'яднаньня арабау.

Прадстаунік шэйха Гэджаса прапанувау мірнуй конфэрэнцыі аб'яднаць усе арабскія дзяржавы ад Чырвонаго мора да Пэрсідзкай затокі у адну дзяржаву, нязалежную ад Турцыі і знайходзячуюся пад аховаю Злучаных Штатау.

Усьмірэньня манархістау.

У Португаліі выбухнула пaустаньня манархістау, але распубліканцы, маючы шмат артылерыі, задавілі мяцеж.

Трэбаваньня Польшчы.

Парыжскія прадстаунікі газэты «Нэуэ Цюрыхэр Цайтунг» мелі магчымасьць бачыць афіцыяльную мапу (карту), якую польскія далягаты хочуць падаць мірнуй конфэрэнцыі. На мапя азначаны рубяжы Польскае Дзяржавы, як іх разумея Польскі Урад. У склад Польшчы павінна увайсьці тэрыторыя у 405 тысяч квадр. кіломэтрау з насяленьням у 38 мільёнау. Польшча згаджаецца адступіць незалежнуй Ліцьве частку свае гістарычнае уласнасьці па усходзя, але пагрáбуя себе Вільню, Гродню і Мінск, адкуль рубяжы Польшчы павінны прайсьці на усход ад Кіява. Валынь і Падоль застаюцца за Украйнай.

Нямеччына і Польшча.

Як павядамляюць нямецкія газэты, палякі занялі Бомот і Упру (у Пазнаньні) і падыйшлі на пяць кіломэтрау да Брандэнбургскае граніцы. У Познані палякамі абвешчана мабілізацыя навабранцау 1896—99 гадоу.

Польшча і Літва.

Варшауская літоуская газэта «Коррэспондэнцыя Лістува» павядамляя, што два прадстаунікі Літоускаго Ураду (Тарыбы) падалі Міністру чужаземных спрау ноту, падпісаную Прэзыдэнтам Літоускае Рады Міністрау Слежэвіціусам. У ноця гаворыцца, што Літоускі Урад шчыра вітая падмогу, запранованую яму Польскім Урадам, але згаджаецца прыняць яе толькі пад варункам няадкладнаго прызнання Польскаю Дзяржаваю нязалежнае Літоускае Дзяржавы са сталіцаю у Вільні і назначэньня польскаго дыпляматычнаго прадстауніка у Ліцьве.

Польска-чэскія адносіны.

Як павядамляя бюро друку Брэслаускае Народнае Рады горад Одэрбэрг у Сілезіі заняты чэскім войскам посьля крывавае бойкі з палякамі.

Прадстауніцтва Польшчы.

Урад Падэрэускаго талеграфна павядаміу Польскі Нацыянальны Камітэт у Парыжу, што прызнае яго прадстаунікам польскіх інтарэсау пярад урадамі хаурусных дзяржау.

Пратэст Польскаго Ураду.

Падэрэускі зьвярнууся да Чэха-славацкаго Ураду с пратэстам проціу насуваньня чэха-славацкаго войска у Сылезіі.

Жыдоускія пагромы.

Венская газэта «Моргэншэтэ» павядамляя аб лічных пагромах жыдоускіх крамау у Ропбожынцэ і Тарнобжэк (у Галіцыя). Жыдоуская насяленьня надта пярапалохана.

Хадайнічаньня Літоускае буржуазеі.

Бэрлінскія урадовыя і буржуазныя газэты друкуюць лічныя заявы ад нямецка-літоускае буржуазеі, у якіх выказываюцца пажаданьня аб далучэньні Літвы да Нямеччыны. Гэтыя заявы тлумачацца хаценьням літоускае буржуазеі уцягнуць нямецкая войска у барацьбу з Радавай Расеяй.

Абаронцы літоускае контр-равалюцыі.

Нямецкі прадстаунік пры Літоускуй Тарыбя заявіу, што нямецкая войска павінна астацца у Ліцьве датуль, пакуль Літоускі Урад ня зможа сам абараніцца ад палякау і бальшавікоу.

Далягацыя Літоускай Тарыбы.

Далягацыя Літоускаго ураду, складзеная з 2 літвіноу, 1 жыда і 1 беларуса, выехала з Бэрліну да Лёндану і Парыжу.

Шэйдэман памагая Тарыбя.

Начальнік нямецкаго штабу павядамляя, што нямецкі урад пастанавіу памагчы Тарыбя у справя тварэньня арміі.

Вазстанова Польшчы.

Французкі урад абвясьціу, што Францыя намерана вазстанавіць Польшчу у яе даунейшых рубяжох, а таксама вярнуць іой провінцыі, забраныя Аустрыяй і Прусіяй і забяспечыць нова-паустаючуй дзяржавя выхад да мора.

Украінскія дамаганьня.

Як павядамляя Украінская Бюро-Друку, Урад Заходня-Украінскай Распублікі, паслау павядамленьня Ураду Вэнгрыі, што украінцы займуць тыя часткі Вэнгрыі, гдзе большасьць насяленьня належыць да украінскаго народу.

Ірляндзкая Распубліка.

У горадзя Дубліня сабрауся Ірляндзкі Нацыянальны Конгрэс, які 21 января абвясціу Ірляндзкую Распубліку. Конгрэс патрабуя выводу з Ірляндыі ангельскаго войска. Сябры Конгрэсу прысягнулі не шкадаваць свае працы дзеля вызваленьня Ірляндыі з-пад ангельскаго уціску.

Хадайнічаньня латышскае буржуазеі.

Да Стакгольму прыехау Прэзыдэнт Латышскае Рады Міністрау Ульман дзеля згаворау са Швэдзкім Урадам аб падмозя буржуазнуй Лацьвіі.

Дзеля барацьбы з бальшавікамі.

Французская газэта «Тан» павядамляя, што на конфэрэнцыі хаурусьнікау разглядалася пытаньня аб ваеннум умяшацельства у Польшчы дзеля барацьбы с пашырэньням бальшавізму. Праэктуецца заняцьця гарадоу Данцыга і Торна. «Жарналь» піша, што нібы то у Нямеччыне намобілізавана больш за 60 дывізій дзеля паходу на усход, які пачнецца у бліжэйшым часе.

Нязадаваленьня Мілюкова.

Мілюкоу у размовя з прадстаунікомі «Агенства Рутэра» заявіу, што запрашэньня на конфэрэнцыю бальшавікоу зробляная ім хаурусными дзяржавамі,—іон лічыць вялікаю абмылкаю. «Адына дарога да развязкі расейскаго пытаньня, сказау Мілюкоу,—«гэта скінуць уладу бальшавіцкіх разбойнікау». Мілюкоу зьвярнууся да хаурусьнікау з прозьбаю падтрымаць усе процівабальшавіцкія сілы.

Редактор и Издатель:

Редакционная Коллегия.

Тов. белоруссы—коммунисты и им сочуствующие!

Желающие поступить и перевестись из Советских учреждений в 9-й Белорусский Полоцкий Полк обращайтесь за справками в Спасские казармы, первый флигель, 3 этаж, ком. № 9, и Пречистенский бульвар 29, кв. 24.

3-я Государственная типография (Р. С. Ф. С. Р.) Тверская, Мамоновский пер., д. 12.